# «І ЭКАНОМІКА, І ПАЛІТЫКА, І ГУМАНІТАРНАЯ СФЕРА Ў НАС З ТАДЖЫКІСТАНАМ РАЗВІВАЮЦЦА НЯДРЭННА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Што датычыцца гандлёва-эканамічных адносін Беларусі і Таджыкістана, то, па словах Аляксандра Лукашэнкі, тавараабарот паміж краінамі пастаянна расце і сёлета можа дасягнуць 100 мільёнаў долараў. «Але я хачу, каб вы разумелі: мы гатовы вашу прадукцыю, асабліва сельскагаспадарчую, тую, якой у нас, на жаль, няма, купляць у любых аб'ёмах. У сувязі з гэтым Таджыкістан звярнуўся да нас з просьбай аб стварэнні тут магутнага гандлёвага цэнтра. Вы павінны ведаць, што мы ўсё зробім дзеля таго, каб ён тут быў. Мы прапанавалі вашым ініцыятарам тры месцы ў Мінску. Калі не задавальняе, падбяром яшчэ ўчастак. Гатовы сумесна з вамі ў гэтых адносінах працаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён запэўніў, што ўся прадукцыя, якая вырабляецца ў Таджыкістане — алюміній, бавоўна, сельгаспрадукцыя і іншая, — будуць запатрабаваны ў Беларусі.

«Словам, і эканоміка, і палітыка, і гуманітарная сфера ў нас развіваецца нядрэнна. І ў ваенна-тэхнічных адносінах мы таксама працуем нядрэнна. Гатовы павялічваць аб'ёмы тавараабароту да такой ступені, у якой гэта неабходна дружалюбнаму нашаму Таджыкістану», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

Эмамалі Рахмон падзякаваў свайму беларускаму калегу за сардэчны прыём. «Я хацеў бы адзначыць паспяховае старшынства беларускага боку ў АДКБ. Мы вельмі ўдзячныя вам за вашы намаганні падчас старшынства ў гэтай арганізацыі. Мы зрабілі вельмі шмат», — адзначыў ён.

Таджыкскі лідар таксама падкрэсліў рост тавараабароту з Беларуссю. «Гэта значыць, ёсць добрая дынаміка развіцця нашых двухбаковых гандлёва-эканамічных сувязяў. Добра працуюць нашы сумесныя прадпрыемствы ў Таджыкістане. Гуманітарная сувязі развіваюцца паспяхова», — сказаў ён.

Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі стан і перспектывы ўзаемадзеяння, міжнародную і рэгіянальную праблематыку.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Бяспека

# ЗА ЎЗАЕМАПАВАЖЛІВЫ ДЫЯЛОГ, РАЗРАДКУ І РАЗВАЖНАСЦЬ

**Напярэдадні саміту АДКБ, які праводзіць у беларускай сталіцы сёння, адбылося сумеснае пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў, Савета міністраў абароны і Камітэта сакратароў саветаў бяспекі краін дзяржаў — удзельніц АДКБ.**
**Пасля перагавораў дэлегацый міністр замежных спраў Беларусі Сяргей АЛЕЙНІК расказаў журналістам падрабязнасці сустрэчы.**

Паводле слоў міністра, падчас пасяджэння адбыўся грунтоўны і даверны дыялог аб ваенна-палітычнай абстаноўцы ў рэгіёнах калектыўнай бяспекі АДКБ і ў прылеглых зонах, дынаміцы яе развіцця і ўплыве на бяспеку краін — членаў арганізацыі.

«Мы ўсе сышліся ў меркаванні, што сітуацыя ў сферы міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, на жаль, працягвае пагаршацца. У глабальным плане гэта абумоўлена сістэмным крызісам міжнародных адносін і непазбежнай трансфармацыяй старога светапарадку. На вялікі жаль, працягваюць мэтанакіравана разбурацца архітэктура еўразійскай бяспекі, дэвальвавацца механізмы раззбраення і кантролю над узбраеннямі», — сказаў Сяргей Алейнік.

Паводле яго слоў, апошні прыклад у гэтым сумным спісе — прыпыненне членамі НАТА дзеяння Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе. Раней гэты дакумент быў адной з апор агульнаеўрапейскай бяспекі.

«Чым і калі запаўняць сістэмны прабел у сферы агульнаеўрапейскага кантролю над узбраеннямі, пакуль невядома, — адзначыў дыпламат. — Адсутнасць узаемнага даверу, паглыбленне канфрантацыі і адкрыта мілітарысцкая бездапаказная рыторыка з боку шэрагу заходніх палітыкаў не садзейнічаюць аднаўленню дыялогу па гэтым пытанні».

Дзейнасць АДКБ, падкрэсліў Сяргей Алейнік, мае абарончы характар. Арганізацыя нікому не пагражае, не ўмешваецца ў справы іншых дзяржаў і заўсёды выступала і выступае за ўзаемапаважлівы дыялог, разрадку і разважнасць.

«На знешнім перыметры АДКБ захоўваецца вельмі напружаная сітуацыя. На заходнім фланзе ідзе непрапарцыянальнае і неабгрунтаванае нарошчванне ваенных патэнцыялаў краін — членаў НАТА, якія ў прынцыпе і так абаронены сваім членствам у блоку. Кратна павялічваюцца ваенныя бюджэты, колькасць узброеных сіл і іх канцэнтрацыя каля нашых граніц. «Праводзіцца вялікая колькасць вучэнняў, у тым ліку ў непасрэднай блізкасці ад зоны адказнасці Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Пры гэтым максімальна зніжаецца транспарэнтнасць, хоць мы са свайго боку стараемся дэманстраваць адкрытасць», — звярнуў увагу міністр.

У той жа час паўднёвыя граніцы АДКБ падвяргаюцца ўздзеянню шматлікіх і разнапланавых выклікаў і пагроз транснацыянальнага характару, такіх як тэрарызм і экстрэмізм, наркатрафік, нелегальная міграцыя.

Канфлікт ва Украіне прадаўжае заставацца болевым пунктам і галоўным дэстабілізацыйным фактарам ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне, адзначыў Сяргей Алейнік.

«У гэтых найскладанейшых геапалітычных умовах намаганні беларускага старшынства ў АДКБ былі накіраваны на павышэнне згуртаванасці нашай арганізацыі, кансалідацыю сумесных намаганняў па прадухіленні дэстабілізацыі ў нашай зоне адказнасці, умацаванні бяспекі яе дзяржаў-членаў. Менавіта гэтым быў абумоўлены і дэвіз беларускага старшынства «праз салідарнасць і супрацоўніцтва да міру і бяспекі». Намі былі абазначаны прыярытэтныя напрамкі старшынства на ўнутраным і знешнім контурах. На іх рэалізацыю нацэлены шырокі пералік мерапрыемстваў у палітычнай, ваеннай, ваенна-тэхнічнай сферах, а таксама па лініі процідзеяння транснацыянальным выклікам і пагрозам бяспецы», — расказаў кіраўнік беларускага МЗС.

Сітуацыя на Блізкім Усходзе, паводле слоў Сяргея Алейніка, таксама стала адной з тэм сумеснага пасяджэння. «Мы выказаліся за спыненне кровапраліцця і за мірнае ўрэгуляванне блізкаўсходняга крызісу, канфлікту палітыка-дыпламатычнымі сродкамі на аснове рэзалюцый Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, шляхам стварэння дзвюх дзяржаў», — сказаў міністр.

Па выніках перагавораў бакі адобрылі і падпісалі каля 20 дакументаў у палітычнай і ваеннай сферах, а таксама ў галіне процідзеяння сучасным выклікам і пагрозам бяспецы. Канчаткова зацвердзяць іх павінны кіраўнікі дзяржаў на сённяшняй сесіі Савета калектыўнай бяспекі.

**Паводле БелТА.**

# АДМІНІСТРАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭДУРЫ — У ЭЛЕКТРОННЫ ФАРМАТ, БЮДЖЭТ ФСАН — З ПРАФІЦЫТАМ

## Сенатары адобрылі шэраг законапраектаў, у тым ліку па сацыяльным абслугоўванні

**На пасяджэнні адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі сенатары адобрылі шэраг праектаў законаў, у прыватнасці «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах адміністрацыйных працэдур», «Аб змяненні законаў па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльных выплат», «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2024 год», «Аб ратыфікацыі Мемарандума аб абавязацельствах Рэспублікі Беларусь у мэтах атрымання статусу дзяржавы — члена Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва».**



Фота БелТА.

### ДЛЯ ДАСТУПНАСЦІ І ЗРУЧНАСЦІ

Якія змяненні прапануюцца для павышэння даступнасці і зручнасці адміністрацыйных працэдур, расказаў **міністр юстыцыі Сяргей ХАМЕНКА**, прадстаўляючы сенатарам праект закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах адміністрацыйных працэдур».

Паводле слоў міністра, значны блок змяненняў накіраваны на комплекснае рэгуляванне пытанняў інфармацыйна-камунікацыйнага ўзаемадзеяння пры ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур. Гэта абумоўлена тым, што цяпер актывізавана работа ўсіх дзяржаўных органаў па пераводзе працэдур у электронную форму. Менавіта шырокае прымяненне інфармацыйных тэхналогій створыць максімальную зручнасць, аператыўнасць і даступнасць гэтых паслуг для грамадзян і суб'ектаў гаспадарання. А гэта, безумоўна, дасць магчымасць забяспечыць практычную рэалізацыю патрабаванняў абноўленай Дырэктывы № 2.

Ён звярнуў увагу на тое, што цяпер адміністрацыйныя працэдуры, працэс якіх поўнасцю лічбавізаваны, адсутнічаюць. Размешчаныя на адзіным партале паслугі прадугледжваюць магчымасць электроннага ўзаемадзеяння толькі на стадыі падачы заявы. У якасці навел, накіраваных на павышэнне даступнасці, зручнасці і аператыўнасці ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур, прадугледжана магчымасць падачы зацікаўленай асобай дакументаў незалежна ад яе месца жыхарства (месца знаходжання), а таксама выкарыстання праактыўнага фармату.

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ**, новым дакументам уводзіцца такі інстытут, як праактыўны фармат рэалізацыі адміністрацыйнай працэдуры, калі тыя ці іншыя дзеянні ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў звязаны з узнікненнем тых ці іншых юрыдычных падзей, напрыклад, нараджэннем дзіцяці, уступленнем у шлюб.

— Рэалізацыя самой адміністрацыйнай працэдуры не будзе залежаць ад заяўнага характару і дзеянняў самога грамадзяніна, а будзе з'яўляцца абавязкам упаўнаважанага дзяржаўнага органа — сабраць неабходны пакет дакументаў і праінфармаваць грамадзяніна аб надыходзе тых ці іншых прававых наступстваў. Такім чынам гэта вельмі важны праект заканадаўчага акта, які, безумоўна, пасадзейнічае спрашчэнню працэдуры рэалізацыі грамадзянамі сваіх маёмасных правоў і ў перспектыве, калі ўся сістэма аказання электронных паслуг ужо будзе замкнута на адзіным партале электронных паслуг, паслужыць таму, што грамадзяне ў максімальна зручным для сябе рэжыме і максімальна аператыўна змогуць вырашаць усе пытанні, звязаныя са сваім жыццезабеспячэннем, — патлумачыў Сяргей Сівец.

### ЗАДАЧЫ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ БУДУЦЬ ВЫКАНАНЫ

Прадстаўляючы законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльных выплат», **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** адзначыла, што ва ўмовах дэмаграфічнага старэння насельніцтва клопат аб старэйшым пакаленні становіцца выклікам для ўсяго грамадства.

— У прыярытэце дзяржавы застаецца галоўны прынцып — максімальна стварыць умовы для старэння каля дамашняга ачага, — падкрэсліла Ірына Касцевіч.

Праект закона накіраваны на ўдасканаленне дзейных прававых механізмаў у сферы сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і павышэння даступнасці сацыяльных паслуг на аснове індывідуальнай ацэнкі патрэбы грамадзян у такім абслугоўванні.

У ліку асноўных навaўвядзенняў — устанаўленне правоў і абавязкаў пастаўшчыкоў і атрымальнікаў сацыяльных паслуг; арганізацыя дзейнасці камерцыйных арганізацый, якія аказваюць сацыяльныя паслугі ў форме стацыянарнага сацыяльнага абслугоўвання, на падставе ліцэнзіі; дапаўненне пераліку паўнамоцтваў дзяржаўных органаў у галіне сацыяльнага абслугоўвання. Таксама прапануецца вызначыць пералік дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання, змяніць назву асобных устаноў (дамы-інтэрнаты на пансіянаты, спецыяльныя дамы на дамы (кватэры) суправаджальнага пражывання). Праектам закона таксама прадугледжана ўстанаўленне права арганізацый па бясплатным падвозе работнікаў да аддаленых устаноў сацыяльнага абслугоўвання ў выпадку адсутнасці рэгулярных перавозак транспартам агульнага карыстання.

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ,** каментуючы законапраект «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2024 год», адзначыў, што дакумент захоўвае сацыяльную скіраванасць.

— Падводзячы вынікі напаўнення бюджэту фонду ў бягучым годзе, мы можам канстатаваць, што ён выконваецца з прафіцытам. Прафіцыт звязаны з тым, што асноўныя адлічэнні робяцца з заработнай платы, а ў краіне яна расла, прычым нядрэннымі тэмпамі. Гэта дазволіла ў поўным аб'ёме дасягнуць запланаваных паказчыкаў па росце пенсій, стабільнай выплаце рознага віду дапамог. Прымаючы праект на наступны год, мы таксама закладаем бюджэт з прафіцытам. Пры гэтым мы бачым, што тыя прагнозныя паказчыкі па росце заработнай платы, якія праліччыў урад, таксама дазволяць у поўным аб'ёме выконваць задачы сацыяльнай абароны насельніцтва, якія стаяць перад фондам, прычым з сур'ёзным ростам, — адзначыў Дзмітрый Дзямідаў.

**Алена КРАВЕЦ.**